■ Партнёры

# Таваразварот з В'етнамам можа павялічыцца да $500 млн

**У гэтую пятніцу В'етнам адзначае свой 71-ы Дзень незалежнасці. Сёлета колькасць беларускіх турыстаў у гэтай азіяцкай краіне павялічылася на 65% у параўнанні з мінулым годам. Так, на падарожжах у В'етнам адбілася ўвядзенне мінулым летам бязвізавага рэжыму на паездку да 15 дзён.**

У плане па развіцці двухбаковых адносін ёсць і павелічэнне тавараабароту да $500 млн да 2018 года. В'етнам з насельніцтвам больш за 90 млн чалавек з'яўляецца прывабным рынкам для замежных інвестараў. З 5 кастрычніка пачне працаваць зона свабоднага гандлю ЕАЭС і В'етнама, што, безумоўна, паўплывае на актыўнасць экспарцёраў і імпарцёраў.

— В'етнам працягвае праводзіць незалежную шматвектарную знешнюю палітыку, актыўна інтэгруецца ў міжнародны і рэгіянальны працэс і надае вялікую ўвагу ўмацаванню і развіццю адносін з сяброўскімі краінамі, — заўважыў пасол В'етнама ў Беларусі Ле Ань.

Пасля афіцыйнага візіту Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі ў Ханой напрыканцы мінулага года актывізавалася двухбаковае супрацоўніцтва. Важным напрамкам у партнёрстве з'яўляецца арганізацыя сумесных зборачных вытворчасцяў на тэрыторыі В'етнама. Для гатовай прадукцыі будзе адкрыты і рынак АСЕАН. Акрамя гэтага, Ле Ань адзначыў, што в'етнамскі бок зацікаўлены ў пераайманні беларускага вопыту будаўніцтва метро. Чакаецца, што ў пачатку наступнага года кіраўнік Сацыялістычнай Рэспублікі В'етнам Чан Дай Куанг прыедзе з візітам у Беларусь.

**Надзея АНІСОВІЧ**

■ Выбары-2016

# КАБ РАЗГЛЕДЗЕЦЬ СВАЙГО КАНДЫДАТА

## У гэтым дапамогуць павелічальнае шкло і спецыяльны трафарэт. Трэнінгі з удзелам членаў выбарчых камісій мадэліруюць сітуацыі пры галасаванні

**Для людзей з абмежаванымі магчымасцямі на ўчастках для галасавання ствараюцца неабходныя ўмовы. Пра гэта паведаміў старшыня Гомельскай абласной выбарчай камісіі па выбарах дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь шостага склікання Мікалай СТОШ.**

— У прыватнасці, для тых, хто не бачыць, будуць прапанаваны спецыяльныя трафарэты, якія дапамогуць такім людзям ажыццявіць свой выбар самастойна і без памылак. Для тых, хто дрэнна бачыць, прапануем павелічальнае шкло. Дарэчы, сітуацыі, як правільна дапамагчы людзям з абмежаванымі магчымасцямі, прайграюцца на спецыяльных трэнінгах, у якіх удзельнічаюць члены ўчастковых выбарчых камісій. Мадэлююцца розныя варыянты паводзінаў. Напрыклад, што рабіць у дзень выбараў ці на датэрміновым галасаванні з людзьмі, якія не пражываюць на гэтай тэрыторыі ці паводзяць сябе неадэкватна. Абмяркоўваем сітуацыі, якія могуць узнікнуць пры стасунках з прадстаўнікамі СМІ ці міжнароднымі назіральнікамі. І, канешне, нагадваем пра выкананне выбарчага заканадаўства.

У Гомельскай вобласці створана 1038 участкаў для галасавання на выбарах дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі шостага склікання. Участковыя выбарчыя камісіі ўжо прыступілі да дзяжурства. На кожным участку для галасавання знаходзяцца спісы выбаршчыкаў. Кожны загадзя можа праверыць, ці ёсць яго прозвішча ў гэтым спісе. Акрамя таго, на выбарчых участках змешчаны звесткі пра кандыдатаў у дэпутаты. З біяграфіямі патэнцыяльных народных выбраннікаў таксама можна азнаёміцца.

— Акруговыя камісіі завяршылі друкаванне бюлетэняў для галасавання і запрашэнняў на выбары, — адзначае Мікалай Стош. — Перыяд агітацыі працягваецца. Аднак не ўсе кандыдаты актыўна ўключыліся ў гэты працэс — 16 з 67 кандыдатаў увогуле не маюць давераных асоб. Толькі 39 стварылі ўласныя выбарчыя фонды. Частка прэтэндэнтаў на дэпутацкі мандат адмовілася ад бясплатнага выступлення ў эфіры па тэлебачанні і радыё. Ведома, улічваючы гэтыя факты, эфектыўнасць правядзення агітацыйных мерапрыемстваў зменшаецца. Празрыстых урнаў на гэтых выбарах стане некалькі больш (на папярэдніх выбарах на Гомельшчыне празрыстай была кожная дзясятая скрыня). Але ж гэта будзе залежаць ад фінансавых магчымасцяў на месцах.

Акрамя таго, Мікалай Стош акцэнтаваў увагу на грамадзянскім абавязку выбаршчыкаў, ад актыўнасці якіх на выбарах залежыць будучыня нашай краіны:

— Галоўная задача парламентарыяў — распрацоўка і прыняцце законаў, па якіх наша краіна будзе эфектыўна працаваць. Таму хацелася б, каб усе выбаршчыкі выявілі актыўную грамадзянскую пазіцыю і прагаласавалі на карысць таго ці іншага кандыдата. Аддайце свой голас за будучыню нашай краіны.

Дададзім, што на Гомельшчыне зараз права голасу на парламенцкіх выбарах маюць больш за 1 мільён 100 тысяч чалавек.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**
*iost@zviazda.by*

# СПРАДВЕЧНАЯ ПЕСНЯ НАД ДНЯПРОМ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Урачыстае адкрыццё Дня беларускага пісьменства «Беларусь — спрадвечная песня» запланавана на 12 гадзін. Адразу пасля яго адбудзецца ўручэнне Нацыянальнай літаратурнай прэміі. На конкурс было пададзена 30 твораў у розных літаратурных жанрах. Сёлета прэмію прысудзяць на ўсіх 7-мі намінацыях. Пераможцы атрымаюць святочныя знакі-сімвалы, дыпломы і грашовыя прэміі. Асаблівым чынам запланаваны і фармат фестывалю кнігі і прэсы, будуць працаваць асобныя павільёны дзіцячай кнігі, літаратурная гасцёўня, выстаўка-прэзентацыя да 500-годдзя беларускага кнігадрукавання. Усяго будзе праведзена каля ста мерапрыемстваў. Упершыню ў свяце беларускага пісьменства прымае ўдзел прадстаўнічая дэлегацыя беларусаў з 19 краін блізкага і далёкага замежжа.


Фота БЕЛТА.

У дзіцячым аддзеле рагачоўскага Дома кнігі.

Сёлета арганізатарам свята, сярод іншых, выступіў тэлеканал «Сталічнае тэлебачанне». **Намеснік генеральнага дырэктара Павел КАРАНЕЎСКІ** прыадкрыў таямніцу:

— Мы прапанавалі нашым ганаровым гасцям, якія завітаюць на Дзень пісьменства, прывезці ў падарунак Рагачову любімыя кнігі. І гэта не абавязкова навінкі — магчыма, кнігі з дзяцінства, найбольш дарагія сэрцу выданні. Пасля адкрыцця іх з дароўным надпісам можна будзе пакінуць у новым Доме кнігі. Такім чынам, кніга стане артэфактам! Мы звярнуліся таксама да вядомых артыстаў, спартсменаў, каб яны расказалі пра свае любімыя выданні — і гэта можна будзе ўбачыць не толькі на свяце, але і ў эфіры СТБ.

Для ўрачыстага адкрыцця тэлеканалам створана літаратурна-тэатральная пастаноўка, у якой паспрабавалі расказаць пра ўсё тое, чым багатыя беларусы. У ёй прымуць удзел народныя артысты Таццяна Мархель і Генадзь Аўсянікаў.

Канцэрт-закрыццё будзе прысвечаны Уладзіміру Мулявіну. У ім прымуць удзел ансамбль «Песняры», а таксама Аляксей Хлястоў, Вікторыя Алешка, гурт «Чысты голас» і іншыя. Скончыцца ўсё вялікім феерверкам.

Пралогі святочнай дзеі аздобіць музыка гуртоў «Стары Ольса», Shuma, Navi і іншых.

Як распавёў Павел Каранеўскі, на сцэне будзе ўстаноўлена вялізнае люстэрка, даўжынёй у 42 метры, аздобленае нацыянальнымі арнаментамі. Экраны, сеткі — усё будзе змяняцца і мільгацець. Напярэдадні былі сабраны ўзоры колераў, вышывак Рагачоўшчыны, каб менавіта яны ўпрыгожвалі галоўны экран.

Запіс адкрыцця можна будзе ўбачыць па тэлебачанні ў нядзелю ў 20.30. Паказ уручэння Нацыянальнай літаратурнай прэміі і канцэрта закрыцця адбудзецца ў панядзелак увечары.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.**
*nina@zviazda.by*

# ПРАЕКТ ДРУЖБЫ І ПАРАЗУМЕННЯ

**У Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі 3 верасня пройдзе міжнародны «круглы стол» айчынных і замежных пісьменнікаў «Сугучча: слова Скарыны ў сучасным свеце»**

**Удзел у абмеркаванні актуальных праблем прысутнасці мастацкага слова ў свеце, судакранання традыцый і часу ў прыгожым пісьменстве прымуць літаратары больш як з 10 краін свету. Кітай, Расія, Азербайджан, Таджыкістан, Казахстан, Сербія, Літва, Латвія — прадстаўнікі гэтых і іншых дзяржаў выкладуць свой светапогляд на стан духоўных каштоўнасцяў, маральных асноў у фарміраванні кансалідаванага грамадства, выхаванні чытача з памкненнямі да міралюбства і ўзаемапаразумення.**

Прадметам размовы, несумненна, стане і сітуацыя з мастацкім перакладам, прысутнасцю іншых нацыянальных літаратур у Беларусі на беларускай і рускай мовах. Міністэрствам інфармацыі нашай краіны даволі шмат зроблена дзеля падтрымкі перакладчыцкіх памкненняў беларускіх паэтаў і празаікаў. Толькі апошнім часам у Мінску пабачылі свет кнігі паэтаў і празаікаў Таджыкістана, Азербайджана, Туркменістана, Чарнагорыі, Сербіі, Кітая, Казахстана, Расіі, Украіны... У Выдавецкім доме «Звязда» закладзены асновы некалькіх кніжных серый: «Светлыя знакі. Паэты Кітая», «Сябрына: паэзія народаў Расіі», «Сяброўства без межаў». У кожнай з іх пабачылі свет кнігі як аўтарытэтных мастакоў слова, якія сёння працуюць у літаратуры, так і класікаў, — народнага паэта Удмурціі Вячаслава Ар-Сяргі, туркменскага шахіра Касыма Нурбадава, паэтаў Кітая Лі Бо, Ду Фу, Ван Вэя, Ай Ціна, Лі Хэ, Лі Цінчжаа. Таксама выходзіць альманах перакладной літаратуры «Сугучча» — ужо пабачылі свет тры выпускі.

**Сяргей ШЫЧКО.**

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

## 1000-гадовы юбілей Брэста сустрэць годна

**25 жніўня Прэзідэнт Беларусі А. Лукашэнка падпісаў распараджэнне «Аб падрыхтоўцы да святкавання 1000-годдзя г. Брэста».**

Менавіта гэтым распараджэннем прадугледжана ўтварэнне рэспубліканскага арганізацыйнага камітэта па падрыхтоўцы і правядзенні святкавання юбілею Брэста. Аргкамітэт узначаліла віцэ-прэм'ер краіны Наталля Качанава. Намеснікам старшыні камітэта прызначаны старшыня Брэсцкага гарвыканкама Аляксандр Рагачук.

Кіраўніком дзяржавы зацверджаны план падрыхтоўкі. Дакумент уключае ў сябе вялікую колькасць мерапрыемстваў, накіраваных на рэканструкцыю і захаванне гісторыка-культурных аб'ектаў. Запланавана таксама будаўніцтва аб'ектаў сацыяльнага і культурна-асветніцкага прызначэння, удасканаленне гарадской інфраструктуры.

Як паведаміў карэспандэнту газеты начальнік аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі гарвыканкама Генадзь Іванчын, цяпер дакументы дэталёва прапрацоўваюцца ў гарвыканкаме з тым, каб вызначыць парадак дзеяння мясцовай выканаўчай улады.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

## Рабочыя месцы і сацыяльныя задачы

**У некалькіх раёнах Гродзеншчыны плануецца ажыццявіць пілотны праект ААН па сацыяльным прадпрымальніцтве.**

Гэтую тэму **прадстаўнік Праграмы развіцця ААН у Беларусі Санака САМАРАСІНХА** абмеркаваў падчас візіту ў горад над Нёманам са **старшынёй Гродзенскага аблвыканкама Уладзімірам КРАЎЦОВЫМ**. Праектам прадугледжана стварыць невялікія прадпрыемствы з сацыяльнай функцыяй, напрыклад, у сферы адукацыі, аховы здароўя, падтрымкі пажылых людзей.

— Мы пастаянна вырашаем пытанні занятасці насельніцтва і заўсёды гатовы пераняць вопыт, убачыць новыя магчымасці вырашэння падобных праблем, — падтрымаў ідэю праекта Уладзімір Краўцоў.

У партнёрстве з Праграмай развіцця ААН у Гродне цяпер будуецца энергаэфектыўны жылы дом новага пакалення, а таксама плануецца рэалізаваць адукацыйны праект для дзяржслужачых і праект «Белмед», скіраваны на здаровы лад жыцця і прафілактыку неінфекцыйных захворванняў. Акрамя таго, Гродна і Ліда будуць сярод дванаццаці гарадоў нашай краіны, дзе ў кастрычніку — снежні сёлетняга года пройдзе кампанія ААН «Інклюзіўная Беларусь». У яе рамках адбудуцца канферэнцыі, выставы, тэатральныя пастаноўкі, музычныя і іншыя імпрэзы, скіраваныя на ўключэнне ў жыццё грамадства так званых уразлівых груп насельніцтва (мігрантаў, бежанцаў, людзей з абмежаванымі магчымасцямі, ахвяр дамашняга гвалту і гандлю людзьмі), устараненне існуючых бар'ераў.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

## Выратавальны гук у Соснах

**За суткі апавяшчальнікі выратавалі шасцярых чалавек. У Любанскім раёне дзякуючы спрацоўцы аўтаномнага пажарнага апавяшчальніка гібелі ў агні пазбегла сям'я з пяці чалавек.**

Сігнал пра пажар у жылым доме ў пасёлку Сосны ратаўнікі атрымалі позна ўначы: гадзіннік паказваў палову чацвёртай гадзіны. Калі першае падраздзяленне МНС, размешчанае ў самім населеным пункце, прыбыло да месца выкліку, мясцовыя жыхары самастойна ліквідавалі агонь. Прачнуўшыся ад гуку прыбора, сям'я пакінула дом. Апроч бацькоў і іх дзвюх шасцікласніц, у ім пражывалі старэйшая дачка ўладальніку жылля з дзіцем. Мяркуецца, што прычынай пажару стала парушэнне правілаў эксплуатацыі электрасетак і электраабсталявання.

У гэты дзень прыбор своечасова папярэдзіў аб загаранні ў доме, які выкарыстоўваўся пад лецішча, пенсіянерцы з Магілёва. Жанчына адпачывала, калі спрацаваў апавяшчальнік. Магілёўчанка пакінула дом, які гарэў.

Па звестках Міністэрства па надзвычайных сітуацыях, з пачатку года дзякуючы спрацоўкам аўтаномных пажарных апавяшчальнікаў выратавана 70 чалавек, з іх 13 дзяцей.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**